Цэна асобнага нумару 20 грошаў.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

НАША ПРАЎДА

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэса 30 гр.	Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок петыту ў 1 шпальту.

№ 3 — Вільня, Серада 6-га красавіка 1927 г. — Год I

Праз акіян.

Ад нашых братоў-эмігрантаў да нас даходзяць з Амэрыкі вестачкі аб іх жыцьці, настроях, імкненьнях.

Не заўсёды вестачкі гэтыя роўна прыемныя, вясёлыя. Бывае, што шчыры жаль выклікаюць яны ў нас—жаль, што магутны адраджэнскі рух, які абхапіў усенькую нашу Беларусь, ня ўсюды і не сярод усіх беларусаў у Новым Сьвеце знаходзе належны водгалас.

Мо ў гэтым вінаваты тыя нашыя дзеячы, якія, перабраўшыся цераз акіян, не здалелі знайсьці дарогі да сэрца і сумленьня нашых эмігранцкіх масаў? Мо варункі жыцьця на чужыне выкаранілі пучуцьцё еднасьці эмігрантаў з сваім родным старым краем і народам?

Пэўне і адно і другое мела тут месца. Бо ж нашыя эміграны пакідалі родны край у тыя часы, калі тутака йшчэ аб беларускім адраджэнскім руху мала хто ведаў — а страшэнная галіта і сацыяльная няволя ў даваеннай Расеі ўсе іх думкі пакіравалі выключна ў бок барацьбы за сацыяльнае вызваленьне працоўных, адкінуўшы ўсё тое, што не вяло простай дарогай да мэты. А калі ў Новы Сьвет папалі першыя адраджэнскія дзеячы, яны — наадварот — наперадзе ўсяго паставілі справу нацыянальную, не здалеўшы выявіць эміграцкім масам тую сувязь, якая істнуе паміж сацыяльным і нацыянальным вызваленьнем працоўных.

Так і не зразумелі адны адных. І толькі нязначная частка чуць не мільённае грамады беларускіх эмігрантаў уявіла сабе ўсю вагу будаваньня роднае культуры—гэнае падставы новага, шчасьлівейшага жыцьця працоўнае Беларусі. Толькі гэная частка здолела зразумець тую вялікую праўду, што навет найлепшыя эканамічныя варункі не памогуць вызваліць чалавека, калі ўсё яго роднае, усё, чым ён жыве, чым адзначаецца сярод другіх людзей, будзе аплёвана, паняволена. Толькі гэныя нямногія зразумелі, што нацыянальная няволя — гэта адзін з найцяжэйшых відаў няволі, які закаваў у зялезныя путы ня толькі цела, але й душу народу. А зразумеўшы гэта, пачалі ў меру сіл і магчымасьці падтрымліваць адраджэнскую працу ў сваей старой Бацькаўшчыне.

Большасьць асталася глухой на заклікі Бацькаўшчыны. Прызвычаіўшыся ўсё разглядаць з практычнага пункту гледжаньня, які пануе ў Новым Сьвеце,—большасьць не магла зразумець, якую карысьць дасьць нашаму народу кніжка ў роднай мове, родная школа і г. д. І гэтая большасьць, папаўшы пад уплывы ці то расейскіх, ці польскіх эміграцкіх арганізацыяў, шчыра думае, быццам можна жывому народу гвалтам прышчапіць чужую культуру, чужую мову! Ім там не баліць, што ня маюць нічога свайго роднага: ім даволі таго, што яны — сытыя!

Але той магутны рух апошняга часу, які разьвіўся сярод беларускіх працоўных масаў у Заходняй Беларусі, злучыўшы разам лёзунгі сацыяльнага і нацыянальнага вызваленьня, ды сабраўшы пад такім сьцягам стотысячную грамаду людзей, — мусіць урэшце пераканаць і нашых амэрыканскіх братоў, што беларускае *нацыянальнае адраджэньне* — гэта ня „выдумка буржуазіі“, як шмат каму з іх дагэтуль здавалася,—а рашуча і ясна выяўленая *воля беларускіх сялян і работнікаў* старое Бацькаўшчыне. Хто мае вушы, хай чуе: хто мае вочы, хай бачыць. А калі пачуюць і пабачаць там—за акіянам—усё тое, што дзеецца у Заходняй Беларусі, дык зразумеюць, што на барацьбу народ ня йдзе ніколі за пусты гук ці пекнае слова!

І тады наш рух да сацыяльнае і нацыянальнае волі перакінецца на той бок бязьмежнага акіяну.

Хай дапамогуць у гэтым нашы сьвядомыя ўжо эміграты. Хай шыраць сярод эміграцыі ў Амэрыцы *праўду аб нашым жыцьці, працы, змаганьні.*

Забава у „разбраеньне“.

Ужо некалькі дзён у Жэнэве дэлегаты вялікіх дзяржаваў „гуляюць у разбраеньне“. Падгатаваўчая камісія мае падрыхтаваць паразуменьне і падставы дзеля вялікай сусьветнай канфэрэнцыі, якая ўжо зусім перакуе стрэльбы на плугі ды перальле гарматы ў малатарні...

А пакуль што на жэнэўскай гульні дэлегаты з усіх сілаў стараюцца апукаць адзін аднаго, — абмежыўшы збраеньне ў праціўніка, але схаваўшы чым больш свайго...

Амаль што ня кожная вялікая дзяржава апрацавала свой уласны праект разбраеньня, у якім прадбачацца вялізарныя магчымасьці збраеньня для сябе, ды найбольшыя... абмежаньні для сваіх канкурэнтаў! Так, англіец Сэсіл апрацаваў „англійскую тэзу“, паводле якой абмежаньне зусім не датычыць... марскіх збраеньняў, а перадусім, зразумела-ж, самой Англіі. Бо-ж Англія, ведаеце, зусім асаблівая дзяржава: вялізарны ваенны флёт для яе неабходны, каб забясьпечыць, бачыце,—„камунікацыю з сваімі калёніямі, ці папросту — каб трымаць пад жаралом гарматы мясцовае насяленьне захопленых заморскіх краёў“... За тое англійскі праект ахвярна ды шляхотна згаджаецца на вельмі значнае — роўнае для ўсіх — абмежаньне сухапутных арміяў ды паветранага флёту,— вось напрыклад у Францыі, якая мае найвялікшую армію ды гэтулькі аэрапляваў, што гэта вельмі непакоіць англійцаў...

Француская „тэза“ — зусім адваротная. Маючы патрэбу ў вялізарнай арміі, каб захаваць павадырства ў Эўропе і паўночнай Афрыцы, ды баючыся англійскага і італьянскага флётаў, Францыя згаджаецца ахвотна на абмежаньне марскіх збраеньняў, але бараніць сухапутныя арміі, — апрача сваей, і тыя, што патрэбны ёй дзеля панаваньня над Эўропай: польскую, чэхаславацкую, югаслаўскую... Апрача таго, Француcкі праект дадае, што пад словам „армія“ трэба, напрыклад, у Нямеччыне, — разумець ня толькі лінейныя войскі, але і — усе паў-вайсковыя арганізацыі, дык вось іх можа і трэба абмежыць...

Проці гэтага абураецца ўжо і Італія, дэлегат якой дамагаецца, каб з лічбы гэтых „ваенна-падгатаваўчых арганізацыяў“ выключыць прынамся фашыстаўскую міліцыю... Няменш бурныя спрэчкі ў камісіі ўзьняліся паміж францускім і італьянскім дэлегатамі адносна да пытаньня: ці лічыць краёвую і каляніяльную арміі за адну пры яе абмежаваньні, ці—наадварот,—каляніяльную асобна, дазваляючы ей большыя вольнасьці ад нагляду і абмежаньня. Ведама ж, інтэрэс Францыі ў яе калёніях, дзе больш італьянцаў, як французаў, рашуча вымагае трыманьня на яе „паўдзённых крэсах“ вялізарнае ваеннае сілы. Інтэрэс Італіі, якая блізу зусім ужо ня крыецца з сваім імкненьнем — пры добрай аказіі — захапіць гвалтам француския калёніі ў Афрыцы, дыктуе ей наадварот, дабівацца абмежаньня наагул каляніяльных арміяў, а перадусім—францускай у Афрыцы... Дык газэты сьцвярджаюць, што ніколі яшчэ так ярка і адкрыта ня выявілася небясьпека ваеннага канфлікту аб калоніі між Францыяй і Італіяй, як за мірна-зялёным сталом супольнай культурнай гульні ў пацыфізм і „агульнае разбраеньне“...

У выніку спрэчак перамагла аднак-жа француская „тэза“—пэўна, як найбольш карысная наагул для вялікіх жываедаў, што маюць вялізарныя каляніяльныя „абоpы“ каляровага чалавечага быдла. Умовіліся, што каляніяльныя арміі неяк выключаюцца з агульнай прапорцыі разбраеньня. Гэткім чынам, можна будзе, напрыклад, усе тыя вайсковыя часьці, якія будуць „абмежаны“ у „дзяржаве мацежы“ (у мэтраполіі), папросту пераводзіць і трымаць сабе спакойна ў калёніях, ці на „крэсах“... А што гэта толькі павялічыць ваенныя бюджэты, а перад усім падаткавыя цяжары для насяленьня якраз гэтых калёніяў, — на тое ж яны і заваяваныя, як казаў адзін вялікі прэзыдэнт аднэй з маладых рэспублік нашых часоў.

Заявы латвійскага міністра.

Вельмі цікаўную гутарку з польскім журналістам меў латвійскі міністар замежных спраў Цэленс, які ўславіўся на ўвесь сьвет з прычыны падпісаньня ім гаранцыйнай умовы з Радамі.

Умова аб узаемным ненападаньні і нэйтралітэце між Латвіяй і ССРР мае для Латвіі вялізарнае значэньне, — сказаў міністар. — перадусім дзеля таго, што гэта бараніць край ад небясьпекі быць уцягненым у тую ці іншую ваенную авантуру, скіраваную проці ССРР — „у інтарэсах іншых вялікіх дзяржаваў“... Даволі паглядзець на карту Усходняй Эўропы, каб зразумець усю папросту геаграфічную канешнасьць гэткай палітыкі Латвіі адносна да ССРР... Латвія ня можа вясьці „палітыкі нейкіх спэцыяльных (па заказу Лёндану... Р.) орыентацыяў“. „Для Латвіі магчыма толькі адна орыентацыя — орыентацыя на мір. Гэтая орыентацыя дае найбольш гарантыі для нашай—незалежнасьці“.

Тое, што пішацца аб нейкай „неспадзяванцы“ з падпісаньнем трактату з ССРР, — няпраўда: ужо больш году, як вяліся перагаворы і дасягнена паразуменьне ў цэлым радзе пунктаў. Перагаворы вяліся як з радавым урадам, таксама і з міністрам замежных спраў Эстоніі. А калі радавы пасол выехаў у Маскву за інструкцыямі ў двух спорных пунктах, тады ўсе іншыя, узгодненыя ўжо, былі, як кажуць, „спарафаваны“ (падпісаны першымі літарамі імёнаў і прозьвішчаў асоб, якія вялі перагаворы).

Адзін з спорных пунктаў між Латвіяй і ССРР — гэта адносіны Латвіі да Лігі Народаў, якой яна ёсьць дый хоча астацца сябрам. Латвія хоча сумленна спаўняць свае абавязкі сябры Лігі, але ня можа рабіць гэта й коштам свайго істнаваньня... Эўрапэйская прэса (чытай: англійская) ахвотна ўскладае на плечы малых дзяржаваў розныя цяжкія абавязкі, але дагэтуль — ані з боку Лігі Народаў, ані з боку вялікіх дзяржаваў Захаду ня было нават паважнай гутаркі аб рэальных гарантыях бясьпечнасьці малых дзяржаваў“... Гэтыя-ж дзяржавы, калі ідзе аб іх саміх, дык не здаволіваюцца „гарантыямі з боку Лігі Народаў“, але ствараюць для сябе розныя „лёкарно“ і інш.

Вось, такую-ж самую рэальную палітыку самазахаваньня, не жадаючы быць пры́ладай ні ў чыіх руках, вясьці павінна і Латвія.

З аднаго боку, Латвія хоча ўстанавіць ясныя і выразныя мірныя адносіны з ССРР; гэтае-ж павінны будуць усьлед за намі зрабіць і ўсе іншыя балтыцкія дзяржавы, калі жадаюць для сябе запраўднага гаспадарчага адраджэньня. З другога боку — дзеля далейшага ўмацаваньня міру на ўсходзе Эўропы — Латвія прапануе стварэньне ўсходняэўрапэйскага, ці балтыцкага „Лёкарно“, у склад якога ўвайшлі б „усе дзяржавы паўночна-ўсходняга ўзьбярэжжа Балтыцкага мора — пад гарантыяй ССРР, Нямеччыны, Францыі і Англіі.

Аб тым, каб у гэтае „балтыцкае Лёкарно“ ўваходзіла і Польшча, латвійскі палітык ня кажа ні слова; ён толькі кажа, што Латвія з Польшчай хоча добрых і карысных для абедзьвюх старон адносінаў... Нажаль толькі вось дагэтуль Латвія гаспадарчае карысьці з польскага боку ня мела...

Ніколі не зьніштажай сваей беларускай газэты! Прачытаўшы, давай суседу, ці знаёмаму, каб і ён пазнаў праўду аб жыцьці свайго народу і даведаўся, што робіцца на сьвеце!

Барацьба за вызваленьне Кітаю.

Абстрэл кітайскага ўзьбярэжжа.

Англійскія ваенныя караблі—нібы-то ў барацьбе з кітайскімі марскімі разбойнікамі—пачалі папросту бамбардаваць мірнае кітайскае насяленьне шанхайскага ўзьбярэжжа. Гэта выклікала страшэннае абурэньне ў ва ўсім Кітаі. Наагул, „стоючыя на чале цывілізаванага чалавецтва“, англійцы вядуць сябе так, што навет амэрыканцы і японцы ня хочуць ісьці з імі побач у кітайскай іх авантуры... Гэткім чынам яны толькі самі сабе шкодзяць, дый будуць няўхільна пакараны...

Ня ўнімаюцца.

Англійскі ўрад пастанавіў выслаць у Кітай новую падмогу — 3 з паловай тысячы жаўнераў.

Бунт у індыйскім войску ў Гонконгу.

З Гонконгу пішуць, што два батальёны індыйскіх войск, якія прывезьлі сюды англійцы дзеля барацьбы з кітайцамі, збунтаваліся, адмовіўшыся ваяваць проці кітайскіх братоў. Тады англійцы сьпешна адвезьлі іх назад, замяніўшы англійскімі часьцямі.

Цікаўная заява Чанг-Кай-Шэка.

Галоўны камандзір кантонскіх войск Чанг-Кай-Шэк зрабіў прадстаўніку англійскага прэсавага агенцтва такую цікаўную заяву.

„Вы пытаецеся, як я буду паступаць з дзяржавамі?—Вельмі проста. Перадусім мы аб'явім скасаванымі ўсе аднабокія бясправўныя ўмовы. Проці тых дзяржаў, якія ня згодзяцца на гэта, мы пачнем ужываць вельмі добрае ды дзейнае срэдтва: эканамічны байкот. Кітайскі народ ня зложыць рук, пакуль не даб'ецца свайго права. Перагаворы будзе вясьці дыплямагыя, але над ёй будзе націск сьведамасьці ды волі ўсяго кітайскага народу... А трэба ж прызнаць, што гэтая сьведамая воля кітайскага народу аказалася цяпер сілай, якая здолела грунтоўна зьмяніць міжнародавае палажэньне нашага краю“...

„З Нанкінам — справа скончаная. Але кантонскія жаўнеры не вінаваты ў яго разгроме: рабавалі яго жаўнеры паўночнай арміі, а за іх мы адказнасьці не бяром. Вельмі жаль, што амэрыканцы далі сябе ўцягнуць у англійскую авантуру; гэта толькі пашкодзіць ім, бо паставіць іх у гэткае самае палажэньне, як тое, у якім апынуліся англійцы ў Кітаі... Мы ня зьбіраемся ўжываць сілы проці чужаземных канцэсіяў,—хай гэтую працу ўрэгуляваньня справы зробяць дыпляматы.—Але, калі дзяржавы пачнуць самі тасаваць проці нас сілу ды аружжа, тады, магу запэўніць, — ня хопіць у іх караблёў, каб задушыць імкненьне да волі 400 мільённага кітайскага народу. Запэўняю яшчэ раз, што жыцьцю і маемасьцям чужаземцаў пад нашай уладай ніякай небясьпекі не пагражае“...

Цікаўны пратэст нямецкай калёніі ў Шанхаі.

Англійская прэса страшэнна абурана гэткім фактам ў Шанхаі.

Шанхайскія немцы адмовіліся падпісацца пад адрэсам з падзякай да англійскіх уладаў у Шанхаі—ад імя ўсіх чужаземцаў - за абарону іх канцэсіяў.. Матывуючы сваю адмову, немцы пратэставалі проці таго, што ў адрэсе сказана, быццам „Англія стаіць на чале ўсяго цывілізаванага сьвету“... Дык немцы не маглі, відаць, сьцярпець гэткай пахвальбы!

Уся англійская прэса ў Кітаі трэбуе ад уладаў (ад свайго ген. Дугляса) высылкі ўсіх „нелояльных“ немцаў з Шанхаю. Пакуль-што яшчэ, відаць, англійцы ўсьцяж лічаць Шанхай—англійскай уласнасьцяй...

Пэкінскі ўрад разваліўся.

Кантонскі ўрад распачаў ужо абяцанае наступленьне на Пэкін — адначасна з двух бакоў: з Шанхаю і з Нанкіну.

У Пэкіне вестка аб гэтым зрабіла ўражаньне ўдару пяруна.

Так-званы „пэкінскі ўрад“ складаецца з міністраў, на чале якіх стаіць ведамы дып-

лямат Вэлінгтон Коо; ён пісаў паперы, гутарыў з пасламі дзяржаваў, але, ня маючы ўласнага войска, ня меў ніякай фактычнай сілы,—тым больш, што над ім была цяжкая рука Чанг-Тсо-Ліна, які фактычна вырашаў усе справы, карыстаючыся толькі фірмай „агульна - кітайскага пэкінскага ўраду“... Прадбачучы барацьбу пад Пэкінам між Кантонам і Мукдэнам, гэты „агульна кітайскі ўрад“ прызнаў за лепшае—зьліквідавацца.— Адзін па адным міністры разьбегліся, і ўрадуе цяпер у Пэкіне адкрыта ваеннае камандаваньне мукдэнскіх войскаў, якія акупавалі Пэкін...

Распачалася наступленьне і мангольскай арміі.

Адначасна з наступам кантонскіх арміяў з поўдня, распачалася канцэнтрацыйнае наступленьне з паўночнага захаду мангольскай арміі гэн. Фэнга Перадавыя атрады яго ўжо ўварваліся ў правінцыю Сікіянг. Губэрнатар яе зьвярнуўся аб помач да Чанг-Тсо-Ліна, які выступіў проці Фэнга з значнымі сіламі, паслаўшы ўльтыматум мангольскаму ўраду ў Урзэ. Гэткім чынам Чанг-Тсо-Ліну прыдзецца ваяваць адначасна на двух вялізарных фронтах.

Адозва Камінтэрну.

Польскія газэты зьмяшчаюць зьмест цікаўнае адозвы III Інтэрнацыяналу (камуністычнага) да ўсіх працоўных—у справе здарэньняў у Кітаі, а перадусім—апошняй бойні пад Нанкінам. Адозва ў гэтай бойні ды разгроме красаваўшага багатага кітайскага места вінаваціць азброеных чужаземцаў, якія апрача сваіх наймітаў-жаўнераў паўночнай арміі—самі страшэнна прычыніліся да разьліцьця крыві... Адозва піша, што „цывілізаваныя варвары, з англійскімі імпэрыялістамі на чале, амаль не цалком зьніштожылі места, зруйнаваўшы перадусім работніцкія раёны, ды забіўшы некалькі тысячаў работніцкіх сямей... „Зьверскае праступленьне ўчынена дзеля таго, што апошняя перамога кітайскай рэвалюцыі пагражала панаваньню імпэрыялістаў у Краі. У блізкім часе гэтыя ж імпэрыялісты могуць адважыцца распачаць такі-ж самы разгром Шанхаю, які яны, як бандыты, укралі ў кітайскага народу“... Далей адозва зварачаецца да ўсіх работнікаў сьвету—з заклікам: падняць сьцяг грознага пратэсту проці новай катоўскай вайны, у якую пхае працоўных буржуазія. Пралетарыят усяго сьвету павінен аб‘яднацца ў адзінай думцы і волі: патрэбаваць безадкладнага вываду войск і караблёў чужаземных з кітайскіх абшараў, ды недапушчэньня падвозу новых войск.

Кантон ідзе налева...

Усе спадзяваньні Англіі на раскол у Кантонскім урадзе не спаўняюцца. Наадварот, як пішуць з Ханькоў, пасьля перамогі пад Шанхаем зьменшыліся ўплывы ўмераных элемэнтаў у пануючай у Кантоне партыі Куомінтан, якая лічыць у сваім лоне ўсё, што ёсьць жывога ў Кітаі, ды што стаіць на грунтце поўнай незалежнасьці Кітаю ад чужаземцаў. Крайняе крыло, нешта кшталтам камуністаў, цалком кіруе падзеямі, трымаючы пад пільным кантролем міністра замежных спраў Чэна.

Ясна, што гэта стаіць у сувязі з тым, што Кантон зусім ня лічыць працу сваіх арміяў скончанай: наадварот, лічыць яе толькі яшчэ распачатай, маючы, як пішуць, рашучую волю—ісьці на Пэкін. Дык, пакуль-што, аб нейкім „паразуменьні з імпэрыялістамі“ ня можа быць ніякай гутаркі.

Няудачы Англіі.

У Англіі прадбачаць крызіс яе кансэрватыўнага ўраду. Страшэннае паражэньне англійскай маральна-палітычнай павагі ў Азіі, нязьлічаныя матэрыяльныя страты ў Кітаі, бамбардаваньне безбароннага кітайскага места, агідная крыцельская палітыка ў Эўропе, якая, кажучы аб міры, усьцяж, дзе толькі можна, падпалівае ваенныя пажары,— усё гэта павінна будзе ўрэшце змусіць народ да звальненьня агідных „жондаў“ рэакцыі. Апошнія весткі з Кітаю падаюць у дадатак, што англійскія стараньні стварыць супольны процікітайскі фронт з Амэрыкай і Японіяй (Францыя адмовілася, ня веручы Англіі дый ня хочучы выклікаць ненавісьць ляяльных да Францыі кітайцаў) — праваліліся аканчальна, нават пасьля нанкінскай трагедыі... Дык цяпер Англія павінна будзе рабіць „карацельную экспэдыцыю“ ў Кітаі на ўласную руку, у адзіноцтве. А гэта ж значыць — аканчальна тапіць сябе ў Азіі! Але да ўсіх гэтых паражэньняў у апошні мамэнт выкрылася для англійскай апініі нешта ня менш няпрыемнае: раскрылася для ўсіх платнікаў падаткаў, што ўсе гэтыя скандальныя ды самагубныя паражэньні Англіі ў Азіі ўсё-ж каштуюць вялізарных грошаў... Толькі-што англійскі „канцлер скарбу“ прадставіў парляманту бюджэт, у якім аказваецца недахвату аж 37 мільёнаў фунтаў, ці — 185 мільёнаў даляраў, ці — амаль на цэлы бюджэт Польшчы... Цяпер прыдзецца павялічываць падаткі, а гэтага ўжо англійскія грамадзяне, асабліва буржуазія, вельмі ня любіць.. Каб хаця грошы йшлі на пасьпехі, а то плаці грошы дый за адны паражэньні і скандалы! Сярод кансэрватараў — страшэннае нездаваленьне міністрам скарбу Чэрчылем, адным з самых заядлых рэакцыянэраў. Але вось, пасьля сьвятаў, зьбярэцца парлямант, даведаецца аб дэфіцыце (недахваце) ў бюджэце... Тады — дадуць-жа ж у скуру сучасным уласьцям прадстаўнікі краю!

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

У справе польска радавага трактату.

Радавая прэса шмат мейсца ўдзяляе справе трактату з Польшчай. Піша яна, быццам польскі пасол Патэк прывёз у Маскву з Варшавы ня толькі паўнамоцтвы вясьці перагаворы ў справе гаранцыйнае ўмовы, але і падпісаць самы трактат. Калі-ж у галоўных пунктах трактату будзе дасягнена паразуменьне, тады быццам польскі міністар Залескі паедзе ў Маскву—аддаць візыту Чычэрыну, які быў у Варшаве ў 1925 г.

Урадавы камунікат у справе амэрыканскай пазыкі.

Урад выдаў камунікат—аб рэзультатах падарожы польскай дэлегацыі да амэрыканскіх банкіраў па пазыку.

Як кажа ўрад, польская камісія „цалком узгодніла фінансавыя патрэбы Польшчы з пануючымі на амэрыканскім грашовым рынку настроямі і вымаганьнямі“. Камісія апрацавала ў паразуменьні з амэрыканскімі банкірамі папярэднія варункі, на якіх могбы адчыніцца для Польшчы амэрыканскі грашавы рынак. Пасьля камісія ў супрацоўніцтве з банкірамі апрацавала канкрэтныя прапазіцыі, якія і прывезла цяпер — на разгляд польскаму ўраду. Урад сцьвярджае, што ў лічбе варункаў пазыкі няма міжнароднага кантролю праз якую-небудзь установу. Але можа самі амэрыканскія банкіры будуць праз сваю экспазытуру кантраляваць польскую фінансавую гаспадарку. Аб гэтым урад ня кажа нічога...

Водгукі нападу на пасла Зьдзеховскага.

Больш за паўгоду, здаецца, прайшло, як сьледчыя ўлады—ваенныя і цывільныя—шукаюць спраўцаў бандыцкага нападу на пасла Зьдзеховскага ў яго ўласнай кватэры—унячы — у цэнтры польскай сталіцы. Як сцьвярдзіў тады-ж тагачасны прэм‘ер пан Бартэль, ды як казаў сам пацярпеўшы, нападаўшыя былі афіцэрамі польскай арміі. Правыя газэты згары былі пераконаны, што з гэтага сьледзтва нічога ня выйдзе, дый зусім адкрыта пісалі аб гэтым. Неяк запраўды ж дагэтуль спраўцы нападу ня выкрыты, хаця правыя газэты пісалі, што іх не маглі ня ведаць іх таварышы... І вось, цяпер сьледчы судзьдзя варшаўскага акружнога суда падаў даклад аб „уморжэньні“ справы—з прычыны нявыкрыцьця бандытаў. Аднакжа, Суд не згадзіўся з прапазіцыяй сьледчага, загадаўшы яму далейшае сьледзтва, а побач з тым пастанавіў зьвярнуцца да вайсковых сьледчых уладаў, каб тыя прыслалі яму ўсе матэрыялы сьледзтва ваеннага сьледчага судзьдзі.

У свой час пісалася, быццам цывільныя сьледчыя ўлады маюць працаваць у цесным кантакце з вайсковымі; але вось аказваецца, што цывільны сьледчы не атрымаў ад ваеннага ніякіх актаў ягонае працы...

Зьезд ваяводаў

У Варшаве скліканы зьезд ваяводаў з усяе Польшчы. На павестцы дня — справы палітычна-адміністрацыйныя, а такжа—падрыхтоўка будучых выбараў.

Сусьветны рэкорд...

Нядаўна пачалося сьледзтва ў справе прапажы цэлага таварнага цягніка—з 42 вагонамі, нагружанага вугальлем...

Цягнік выйшаў з аднэй станцыі ў Польскай Сілезіі і — зьнік. Аказалася, што таварны ўрадовец-чыгуншчык на станцыі перарабіў накладныя ды, у змове з нейкім „ведамым добра паліцыі афэрыстам“ Домбровскім—разаслаў паасобныя вагоны па розных, пададзеных гэтым „супольнікам“, адрасох — „знаёмым фірмам“, ад якіх пасьля атрымаў грошы... Паліцыя цяпер шукае па ўсей Польшчы гэных вагонаў, з якіх знайшла пакуль-што толькі каля 10... Урадовец, які сфальшаваў дакумэнты, арыштаваны; але пан Домбровскі, ведама-ж, не чакаў на паліцыю, ды—зьнік, як і яго вагоны.

Стрэл у цягнік на ст. Баранавічы.

Як падаюць польскія газэты, 31-га сакавіка ў кур‘ерскі цягнік на ст. Баранавічы нехта стрэліў. Куля трапіла ў вакно спальнага вагону, у купэ, дзе сядзелі 2 англійцы, не забіўшы, аднак, нікога. Зараз-жа паліцыя пачала шукаць страляўшага, але дагэтуль не знайшла.

Заграніцай.

Фашыстаўская вакханалія ў Коўні.

Дарваўшыся да ўлады, фашыстаўскі ўрад у Літве ўсё „ўмацовае сваё палажэньне“. Але—чым больш умацоўвае, тым больш ворагаў плодзіцца пад яго „жондамі“. Толькі што ён „зьніштажаў камуністаў“; цяпер ужо чарга прыйшла і на сацыял-дэмакратаў, а навет—і на „людоўцаў“, партыі якіх толькі што складалі ўрад у Літве.

Толькі-што—па падазрэньні ў „падрыхтоўцы камуністычнага перавароту“, арыштаваны 60 выдатных сяброў дзьвюх апошніх легальных партыяў. Газэты пішуць, што ўсім ім пагражае... кара сьмерці, калі — не ўмяшаецца заграніца. Але-ж якраз гэтая „заграніца“ прынамся з аднаго боку Літвы— ужо ўмяшалася, — ды толькі на тое, каб у Коўні пасадзіць фашыстаўскіх катаў.

„Хрысьціянскія“ дэмакраты—каты Літвы.

У зьвязку з шалеючым у Літве „белым тэрорам“ фашыстаўскага ўраду, лявіца Сойму патрэбавала скасаваньня „даразных судоў“. Але, ведама-ж, фашыстаўская большасьць у Сойме, а ў першую чаргу — паны „хрысьціянскія“ дэмакраты (хадэкі) ўрачыста правалілі прапазіцыю. Тады ўсе сацыялісты разам з нацыянальнымі меншасьцямі дэманстрацыйна пакінулі паседжаньне.

Заява літоўскага ўрадавага органу.

Орган літоўскага прэм‘ера ў артыкуле аб агульным палітычным палажэньні на Усходзе Эўропы і кірунку літоўскай палітыкі піша:

„У выпадку магчымага аружнага канфлікту Літва станула-б на бок СССР, як сільнейшага за Польшчу. Рады маюць армію, якая лічбова перавышае войскі Фінляндыі, Эстовіі, Латвіі, Польшчы і Румыніі—разам узятых. Дык — з саюзу з СССР Літва мела-б вялікшыя карысьці, чым з саюзу з Польшчай“.

Канфлікт аб Альбанію.

Канфлікт між Югаславіяй і Італіяй аб Альбанію—на першы пагляд лагодзіцца, дзякуючы ўступчывасьці Югаславіі; але, з другога боку, ён усё паглыбляецца з прычыны выразна-правакацыйнай палітыкі Італіі, якую падтрымлівае Англія.

У той час, калі ў Югаславію едзе міжнародавая камісія — дзеля кантролю мірнага стану яе арміі, Італія падрыхтоўвае ў Альбаніі запраўдную вайну з Югаславіяй. Ува ўсе альбанскія порты прыбываюць вялізарныя транспарты ваеннага матар‘ялу з Італіі. Урад Ахмэт Зогу, атрымаўшы ад Італіі 15 мільёнаў ліраў,—пад страшным тэрорам мабілізуе насяленьне да вайны. Гэта выклікае ў розных мейсцах паўстаньні проці дыктатара, якія душацца з слаўным „альбанскім зьверствам“.

Гэта-ж і мае значыць, што — „Англія стаіць на чале сусьветнай цывілізацыі“, ды—„зьяўляецца найвялікшым гарантам сусьветнага міру“.

Паразуменьне Югаславіі з Турцыяй.

Дзеля адпору балканскай палітыцы Італіі, якая паразумелася з Румыніяй, Грэцыяй, Вэнгрыяй і Баўгарыяй,—Югаславія натуральным ходам падзей папіхаецца да цясьнейшага зьбліжэньня з Турцыяй. У апошнія дні турэцкі пасол у Белградзе — пасьля гутаркі з міністрам Пэрычам (югаслаўскі мін. замежных спраў)—сьпешна выехаў у Ангору, відаць, па інструкцыі ад свайго ўраду. Гэткім чынам балканскі канфлікт прычыніцца да ўсё больш выразнага падзелу Эўропы на дзьве праціўныя коаліцыі—„англійска-італьянскую“ і „француcкую“. А гэта бязумоўна змусіць Францыю шукаць паразуменьня і з СССР, ня кажучы ўжо аб узнаўленьні перад ваеннай орыентацыі Сэрбаў—на Расею.

З работніцкага жыцьця.

Забастоўка ў Городні.

„Работнік“ даведаўся, што бастуючыя працаўнікі мястовых прадпрыемстваў у Горадні заявілі рашучы пратэст проці таго, што іх правы на стачку пагвалчаны магістратам, які ў паразуменьні з ваеннымі — паставіў жаўнераў замест работнікаў у электроўні, вадаправодах і інш.

Расправа з работнікамі.

„Работнік“ апісывае абураючыя здарэньні, выкліканыя адміністрацыяй фабрыка „Поціск“ у Варшаве 1 красавіка. Каля фабрыкі сабралася вялікая таўпа работнікаў, якія прышлі дамагацца выплаты належных ім грошы, бо адміністрацыя чамусьці затрымлівае выплату тыднямі. Дырэктар адмовіў, пазываючыся на тое, быццам урад затрымлівае так сама выплату належнасьці фабрыцы. Тады работнікі ўвайшлі ў памяшчэньне фабрыкі паклікаць працаваўшых там работнікаў, каб далучыліся да агульнай дэманстрацыі. Але адміністрацыя замкнула браму, адначасна паслаўшы за паліцыяй. Зьявілася паліцыя. Як апісуе ў № 91 „Работнік“, „паліцыя атакавала таўпу шаблямі і штыкамі ды выперла яе з фабрыкі. У рэзультаце некалькі асобаў ранены“.

Рух сярод польскіх вуглякопаў.

Як паведамляе „Работнік“, распачалася акцыя ўстанаўленьня кантакту і салідарнасьці— ў супольнай барацьбе за лепшае жыцьцё польскіх вуглякопаў усіх горна-прамысловых раёнаў Польшчы. Адбылася канфэрэнцыя дэлегатаў Польскай Сілезіі Дамброўскаго і Кракаўскага раёнаў, на якой прыняты ваенныя пастановы.

У Сойме.

Ці прадоўжаць паўнамоцтвы Сойму і Сэнату?

Газэты пішуць, быццам урад, баючыся новых выбараў, маніцца прадоўжыць паўнамоцтвы сучаснага складу Сойму і Сэнату да красавіка 1928 г.

Апрача ўсяго іншага, ўраду йдзе аб тое, каб чым даўжэй захаваць уласныя паўнамоцтвы, атрыманыя ад гэтага Сойму, бо яны канчаюцца з мамэнтам сабраньня новага Сойму. Дык урад цяпер шукае, да чаго-б прычапіцца, каб зрабіць так, як хочацца, а з другога боку — каб гэта мела від „легальнасьці“.—І вось, быццам знайшлася прычэпка: Канстытуцыя, якая прадбачыць у восені канец Сойму, прадбачыць у той самы час і пачатак бюджэтнай сесіі Сойму, якая ня можа быць ані адкладзена, ані перарвана. Гэткім чынам, гэты Сойм, працуючы яшчэ ад кастрычніка да будучага сакавіка, прыняў-бы бюджэт, а ў чэрвені 1928 г. адбыліся-б новыя выбары.

Ведама-ж, — паны паслы, проці гэтага нічога мець ня будуць!

Аканчальнае паразуменьне соймавай „Пяцёркі“.

У габінэце маршалка Сойму адбылася канфэрэнцыя „пасольскае пяцёркі“ з соймавай камісіі, якая апрацоўвае праект самаўрадавых законаў. „Пяцёрка“, ці навет шасьцёрка, у склад якой, як ведама, уваходзяць усе галоўныя польскія клюбы Сойму — ад эндэкаў да пэпэзсаў і вызваленцаў,—паразумелася аканчальна па ўсім пунктам, якія дагэтуль яшчэ выклікалі спрэчкі. Гэткім чынам, як толькі будзе скліканы на „веснавую сэсію“ Сойм, зараз-жа камісія паставіць на пленум Сойму зусім гатовы праект.

Новы соймавы клюб.

Тры паслы, якія выступілі з „Незал. Хлопскай Партыі“ п. Ваявудзкага, заявілі ў Сойме аб стварэньні імі новага клюбу пад назовам „Радыкальная Хлопская Партыя Беларускіх Зямель“. Аб гэтым паслы паведамілі і калегу Галавача, які падзяляе іх „памяркоўна-радыкальныя“ пагляды, але чамусьці папаў у вастрог—у Вронкі!

Новы прэзыдыум украінскага клюбу.

Сколькі ўжо перавярнулася гэтых прэзыдымаў... А усьцяж ўсё выбіраюць новыя! Нова выбраны прэзыдыум складаецца — з старшыні п. Хруцкага, ды п. п. Назарука і Кавубскага — як віцэ-старшыняў. Сябры Сялянскага Саюзу ня прымалі ўчасьця ў выбарах.

„Знацыяналізаваная“ кааперацыя.

Заходняя Беларусь дужа добра памятае тыя часы, калі сярод беларускага сялянства — пасьля цяжкіх udaraў ваеннага часу— распачаўся быў магутны рух у кірунку наладжаньня эканамічнае самапомачы, перадусім—у пастаці кааперацыі. Гадоў сем-восем назад Віленскі Саюз Каапэратываў лучыў звыш сотні спажывецкіх таварыстваў, якія былі пазакладаны і ведзены самім сялянствам. Саюз аказаў тады вялізарную помач насяленьню, дастаўляючы вёсцы за прыступную цану тавары першае патрэбы, якія пад той час дабываліся з вялізарнымі труднасьцямі—як з прычыны адсутнасьці гэтых тавараў ува ўсей польскай дзяржаве, так і з прычыны благой камунікацыі, дый—урэшце—нястачы гатоўкі ў людзей на вядзеньне гандлю. Абслугуючы беларускую вёску, Саюз—зусім натуральна — адбіваў у сваім складзе нацыянальны склад насяленьня краю,—а як большасьць тутэйшага насяленьня — беларусы, дык і ў Саюзе кіраўнічую ролю ігралі каапэратыўныя дзеячы-беларусы. Аднак, стоючы на агульна-краёвым становішчы, кіраўнікі нашае кааперацыі не карысталіся сваей лічэбнай большасьцяй у Саюзе і заўсёды тварылі Управу Саюзу на падставе супрацоўніцтва ўсіх нацыянальнасьцяў краю. Гэтак ў складзе Управы займалі адпаведнае месца— побач з беларусамі — і палякі, і літвіны, і жыды.

Але іменна гэткага супрацаўніцтва ўсіх нацыянальнасьцяў краю на груньце эканамічнае самапомачы ня мог сьцярпець зьвярыны нацыяналізм таго грамадзянства, якому доля судзіла стацца ў нас „дзяржаўнай“ і „пануючай“ нацыяй. І проці Саюзу была распачата самая непрымірымая барацьба. Пазбаўленьне крэдытаў, усялякія труднасьці пры набываньні і перавозцы тавараў, урэшце — арышты сярод галоўных кіраўнікоў Саюзу— беларусаў, — вось спосабы змаганьня, якое закончылася перамогай польскіх нацыяналістаў і разгромам беларускае народнае кааперацыі. І Саюз, як самастойная арганізацыя грамадзкае самапомачы, мусіў зьліквідавацца, цэлы рад вясковых каапэратываў зачах, а рэшткі пайшлі на кампраміс з „пануючай нацыяй“; і вось—замест старога Саюзу—маем цяпер у Вільні, у былым памяшчэньні гэнага Саюзу, толькі аддзел агульнапольскага саюзу спажывецкіх таварыстваў, кіраванага з Варшавы.

Як-жа выглядае сяньня гэны аддзел і ягоная праца?

Надовячы мы прачыталі справаздачу аб дзеяльнасьці аддзелу ў газэце „Kur. Wil.“. Крыху цыфр бяром з гэтае справаздачы.

Перадусім кідаецца ў вочы надта малая лічба спажывецкіх таварыстваў, якія абслугуе аддзел. З соткі з лішкам іх асталося толькі... 33. Затое з услуг аддзелу карыстаюць 22 арганізацыі зямляробска-гандлёвыя

і вайсковыя, бальніцы, інтэрнаты, грамадзкія і дабрадзейныя ўстановы — ведама-ж, бадай выключна **польскія**...

Далей, у справаздачы чытаем, што аддзел за 1926 год меў абароту бязмала паўтрація мільёна злотых, ды з гэтага на закупы ў варшаўскай цэнтралі прыпадае больш **за паўтара мільёна**. Нават пры найменшым процаньпе заробку, цэнтраля гэтак атрымала значную суму, з якое мела магчымасьць друкаваць каапэратыўную літэратуру, пашыраць працу над разьвіцьцём каапэрацыі, але... **ў польскай мове** і, значыцца, сярод **польскае людпасьці**. А што-ж для нас—для беларусаў? Ды, здаецца, з вялікім трудом удалося беларусам дабіцца, каб віленскі аддзел узяў на сябе палову коштаў пры выданьні Бел. Выд. Т-вам аднае каапэратыўнае брашуры.

Дык якое дзіва, што каапэратыўная праца ў нас ідзе вельмі слаба? Беларускае насяленьне польскае мовы ня ведае, дый да „знацыяналізаванае“ палякамі каапэрацыі адносіцца ня зусім даверчыва. А тым часам справа гэтая мае для нашага сялянства нязвычайна вялікае значэньне і вымагае напружанае, энэргічнае працы: наша вёска патрабуе йшчэ больш эканамічнае самапомачы, чым польская, бо-ж у нас яшчэ не загаіліся паваенныя раны.

Каапэрацыя ў нас пачне разьвівацца шпарчэй толькі тады, калі яна перастане быць адным з чысьленых спосабаў апалячываньня беларускае вёскі, калі польскасьць перастане зьяўляцца першай азнакай каапэрацыйнае працы ў Заходняй Беларусі. Толькі пад варункам **распалячаньня** каапэрацыі гуртаваньне спажўцоў у каапэратыўных таварыствах здолее ѕбняць беларускую вёску **і з'арганізаваць яе жывыя сілы на груньце эканамічнае самапомачы.** А да гэтага ж толькі і павінна імкнуцца **запраўдная каапэрацыя.**

А. Н.

ХРОНІКА.

„Маланку“ ізноў сканфіскавалі! Відаць, сьмех і жарты аказуюцца ня менш „праступнымі“, чым паважныя палітычныя стацьці: каторы ўжо раз улада канфіскуе нумары „Маланкі“ за больш ці менш „вольны“ жарт! Вось, і надовячы камісар ураду на м. Вільню загадаў сканфіскаваць № 6 „Маланкі“ за заметку „Зайздросныя“...

Беларускі вечар. У суботу, 9/IV. г. г. тэатральнай сэкцыяй пры Галоўнай Управе Т-ва Беларускае Школы ў памяшчэньні Беларускай Гімназіі, пры Вострабрамскай вул. № 9 пад кіраўніцтвам гр. Сіняўскага ладзіцца вечарына.

Пастаўлена будзе „Паўлінка“. Канцэртны аддзел пад кіраўніцтвам гр. Шырмы.

Пачатак а 7 гадзіне ўвечары. Білеты можна набываць у Кнігарні Бел. Выд. Т-ва пры Вострабрамскай вул. № 1.

Дзе будуць урадавыя курсы для беларускіх настаўнікаў? На гэтае пытаньне дае адказ у нядзельным нумары „Кур. Віл.“, які піша, што курсы маюць быць ізноў... у Кракаве!

Нават польская газэта абураецца на гэта, слушна кажучы, што гэты выбар месца для курсаў ня суліць нічога добрага ні вучыцялём, ні беларусам наагул. Ясна, што ў Кракаве лектароў з прадметаў беларусазнаўства — няма. Іх знайсьці можна адно толькі ў Вільні, дзе і павінны быць адчынены гэныя курсы. Інакш можа стацца тое, што ўжо раз сталася на ўрадавых курсах якімі кіраваў нейкі пан Пізло, каторы „працаваў над тым, каб беларускаму школьніцтву нічога ня даць“...

Бяда вось толькі ў тым, што, здаецца, і ў Вільні мала ўжо асталося лектароў, якіх куратарыум лічыць „благанадзёжнымі“ і дапускае да выкладаньня беларушчыны...

Новыя мястовыя выбары ў Вільні. Газэты пішуць, быццам у Вільні маюць у бліжэйшы час адбыцца новыя выбары ў мястовую раду. Тое-ж мае быць і ў іншых местах. Паміж іншым, у Варшаве ўжо пачалася гарачая падрыхтоўка ўсіх партыяў да выбараў. Асобныя сьпіскі маюць выставіць, як даведаўся „Роботнік“—пэпээсы, камуністы, Партыя Працы, хадэкі, эндэкі і інш.

Доля парабкоў. Ад 1-га красавіка абшарнікі абвясьцілі ўтраціўшай вагу ранейшую агульную ўмову аб найме. Афіцыяльныя „апякуны“ парабкоў, паны пэпээсы, неяк блага „апякуюцца“ гэтай катэгорыяй работнікаў.

З прычыны таго, што пачаліся масавыя выкіданьні з хат у дварох звольненых са службы парабкоў, урад пастанавіў выдаць дэкрэт, паводле якога звольненыя парабкі маюць права аставацца ў дворных кватэрах да 31 мая с. г.

Безработных прыбывае... У тартаку пры Высокай вул. № 1 у Вільні работнікі асталіся без работы на працяг двух тыдняў—дзеля таго, што гаспадары тартаку не атрымалі ў свой час патрэбнага сыр'я... Няма што й казаць: добрая гаспадарка! А работнікі будуць бяз дай прычыны галадаць два тыдні!

Добрая дзяліцьба! Польскія газэты апісуюць, як чыгункавая дырэкцыя ў Вільні падзязіла 40.000 з лішкам злотых „сьвяточных“ — паміж працаўнікамі дырэкцыі. Гэтак „начальства“, якому і так ня блага жывецца, дастала па ад 200 да 800 зл., кіраўнікі аддзелаў, — ад 100 да 200, старшыя рэфэрэнты — ад 40 да 60 зл., і некатарыя з ніжэйшых урадоўцаў — ад 15 да 20 зл. Рэшта служачых — нічагусенькі! Дык вясёлыя мецімe сьвяты ўся галіта на чыгунцы...

Афіцыяльны курс грошы на 5 красавіка. Даляр—8 зл. 89 гр. Залаты рубель — 4 зл. 60 гр.

5./IV на чорнай біржы ў Вільні за даляр плацілі 8,90. Зал. р. 4,70. Чырв. 3 дал. 90 цэн.

ПАДЗЯКА.

Гурток Т-ва Беларускае Школы ў вёсцы Руды Косаўскага павету складае шчырую падзяку ніжэйпаданым грамадзянам, зложыўшым ахвяры на бібліятэку-чытальню Т-ва ў вёсцы Руды:

Грамадзяніну Кастусю Хаванскаму за 1 зл., Міхалу Хаванскаму за 50 гр., Барысу Адамчуку за 50 гр., Сяргею Крыўшы за 50 гр., Ганне Бульскай за 50 гр., Сымону Шашуку за 50 гр., Мікалаю Спавалу за 50 гр., Рыгору Слушніку за 50 гр., Пётру Дылюку за 40 гр., Васілю Пятуху за 20 гр., Тамашу Пятуху за 20 гр., Мехведу Піліпу за 50 гр., Мехведу Юрку за 25 гр., Бахуру Мікалаю за 50 гр., Бажыдаю Ільлі за 30 гр., Куісу Дзяміну за 30 гр., Глушэні Рыгору за 25 гр., Шышуку Юрку за 50 гр., Рыжко Галене за 50 гр., Ларыёну Глушэні за 35 гр., Пятуху Кастусю за 50 гр., Яну Хаванскаму за 25 гр., Андрэю Мехведу за 50 гр.

**Управа Гуртка Т. Б. Шк.
у в. Руды.**

Што патрэбна дзеля адчыненьня прыватнае народнае школы?

Школьнае куратарыум віленскага вокругу апублікавала гэткае абвяшчэньне ў справе выдаваньне канцэсій (дазволу) на адчыненьне прыватных народных школаў:

„Куратарыум паведамляе, што, пачынаючы ад 1927/28 школьнага году, яно будзе выдаваць **бестэрміновыя канцэсіі** (выключаючы асаблівыя выпадкі) на прыватныя народныя школы.

Прыватныя асобы і законна прызнаныя таварыствы, якія стараюцца аб канцэсію, павінны падаваць просьбы, адрэсаваныя на імя куратарыуму, праз рукі школьнага інспэктара таго павету, у межах якога мае быць адчынена школа, і не пазьней, як да 1-га чэрвеня таго году, у якім школа мае распачаць сваю працу.

Просьбы з вымаганымі дакумэнтамі трэба падаваць асобна для кожнае школы—незалежна ад таго, ці школа была чынная ўжо раней на падставе аднагоднае канцэсіі, ці толькі йшчэ мае быць закладзена. Калі-б дакумэнты былі ўжо раней перасланы ў куратарыум, дык трэба пазвацца на адноснае пісьмо.

Куратарыум напамінае, што арт. 10 распараджэньня Генэральнага Камісара Усходніх Зямель з 11-га кастрычніка 1919 году адносна да школьніцтва і асьветы („Dz. Ust.“ b. Zarz. Cyw. Ziem Wschodnich z dn. 18. XI. 1919 r. № 31, poz. 340) пастанаўляе, што пры просьбе аб дазвол на прыватную народную школу мусяць быць пададзены:

1) сцьверджанае натарыяльна забавязаньне адносных асоб, што бяруць на сябе матэрыяльную адказнасьць за ўтрыманьне школы і маральную адказнасьць за кірунак яе;

2) дакладнае азначэньне школьнага памяшчэньня;

3) заяву павятовага доктара, сцьверджаную старастай павету, што сказанае памяшчэньне адпавядае дзеля школьных мэтаў з пункту гледжаньне гігіены;

4) азначэньне тыпу школы (4 аддзелы, 5 аддзелаў і г. д.), яе праграмы, мовы навучаньня, падручнікаў дзеля карыстаньня вучняў, а таксама лічбы клясаў наагул і лічбы клясаў у мамэнт адчыненьня школы;

5) паказаньне адказнага кіраўніка школы з падробнай падачай ступені адукацыі, кваліфікацыяў і асабістых датаў, як век, нацыянальнасьць, вызнаньне, папярэдняя пэдагагічная практыка і г. д.

Адначасна куратарыум высьняе, што:

1) пад дакладным азначэньнем памяшчэньня трэба разумець падачу падробнага адрасу школы і прадстаўленьне пляну памяшчэньня з паказаньнем памераў;

2) аналягічна да загадаў п. п. IV і V цыркуляра міністэрства рэлігійных вызнаньняў і публічнае асьветы з 31 жніўня 1926 г. № I 9514/26 (Dz. Urz. Min. W. R. i O. P. № 13 poz. 176), сямі і шасьці-класовыя школы могуць быць творaны, маючы найменш 5 пакояў дзеля лекцыяў, 5-клясовыя — найменш 4 пакоі, 4-клясовыя — найменш 3 пакоі і 3-клясовыя — найменш 2 пакоі, — а найвялікшае абцяжэньне вучнямі лекцыйнага пакою можа мець трое дзяцей на 2 кв. мэтры школьнага пакою“.

Юбілей пасла д-ра Я. Выгодзкага.

4 красавіка ўвечары ў салі клюбу інвалідаў жыдоўскае грамадзянства сьвяткавала 70 ўгодкі народзінаў аднаго з найвыдатнейшых сваіх палітычных і культурных дзеячаў, пасла доктара Выгодзкага. На ўрачыстасьць гэтую сабраліся прадстаўнікі бадай усіх палітычных напрамкаў жыдоўскага грамадзянства, каб згодным хорам прывітаць юбіляра. Гэта ўжо адно сьведчыць аб аўтарытэце і павазе, якім карыстаецца доктар Выгодзкі сярод свайго грамадзянства. На ўрачыстасьці гэтай быў такжа прадстаўнік беларускага грамадзянства, старшыня Віл. Беларус. Нацыян. Камітэту гр. Савіцкі І., які ад імя беларускага грамадзянства прывітаў юбіляра. Цікаўна аднатаваць той факт, што на ўрачыстасьці зышліся прадстаўнікі двух найлічнейшых народаў нашага краю: беларусаў і жыдоў. Ані прадстаўнікоў палякаў, ані літвіноў і расейцаў на ўрачыстасьці ня было. У сваей прамове гр. Савіцкі падкрэсьліў, што доўгае сужыцьцё жыдоў з беларусамі прывяло да таго, што абодвы народы зразумелі адзін другога і зжыліся, довадам чаго можа служыць факт прыйманьня ўчасьця цэлага чэроду прадстаўнікоў жыдоўскай інтэлігенцыі ў працы на ніве беларускай асьветы, навукі і літэратуры. Жывым прыкладам гэтага зьяўляецца адзін з выдатнейшых сучасных беларускіх пісьменьнікоў жыд Плаўнік, працуючы над псэўдонімам Зьмітрука Бядулі. Ссылаючыся на папярэдняга прамоўцу, сэнатара Вісьліцкага, які сказаў, што ўжо настаў час, калі трэба рабіць жыдам адзін супольны фронт, гр. Савіцкі паглыбіў гэтую ідэю, указываючы, што супольны фронт трэба расьцягнуць на ўсе меншасьці, каб, памагаючы адзін другому, усьпешна змагацца за свае правы.

Адзначыўшы грамадзкую ахвярнасьць д-ра Выгодзкага, які ў часе нямецкай акупацыі за адважную абарону насяленьня перад немцамі быў пасаджаны апошнімі ў вастрог, Гр. Савіцкі ад імя беларускага грамадзянства вітае д-ра Выгодзкага і жадае яму доўгія гады жыць і працаваць на дабро свайму і беларускаму народу, якіх зьвязывае аднолькавае палажэньне ў Польскай Рэспубліцы, як нацыянальных меншасьцяў. Дружныя воплескі слухачоў былі адказам на прамову.

Шматлічныя прамоўцы, рэпрэзэнтаваўшыя розныя палітычныя напрамкі жыдоўскага грамадзянства згодна падчырківалі заслугі шаноўнага юбіляра. Не абышлося і бяз пэўнага інцыдэнта. Калі прадстаўнік жыдоўскіх дэмакратаў публіцыст з газэты „Тог“ Рэйзін заявіў, што д-р Выгодзкі, ня гледзячы на тое, што працаваў з сіоністамі, усежткі не сапсаваўся, то гэта выклікала буру пратэстаў з боку сіоністаў, але інцыдэнт быў хутка зьліквідаваны. У адказнай сваей прамове юбіляр (між іншым пачаўшы яе ў беларускай мове) дзякаваў прадстаўніку беларусаў і ўсім наагул прамоўцам **за сэрдэчныя** прывітаньні.

З жыцьця Горадні.

✕ **Працэс „32“.** 9 красавіка г. г. у Горадзенскім Акружным Судзе будзе разглядацца справа 32 работнікаў, абвінавачаных ў прыналежнасьці да камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, якая мела на мэце адарваньне Заходняй Беларусі і далучэньне яе да Радавай. Збоку пракуратара выстаўлена 27 сьведкаў. Галоўны сьведка—„фабрыкантка“ гэтага працэсу Надзея Шушкевіч. Абвінавачаныя: Лейба Волынскі, Эдке Абрамовіч, Нахман Рэйзнэр, Мнуха Езёрска, Эстэра Крымска, Роха Рубінштэйн, Мікалай Антанюк, Надзея Самчук, Марыя Ламашэвічанка, Уладзімір Кузнецоў-Курбскі, Эшэль Любіч, Соня Елін, Язэп Войцэх, Гірш Кузніцкі, Абрам Цыбульскі, Сьцяпан Прусак, Мікалай Стрэшка, Янкель Александровіч, Арон Зільбэрбэрг, Трайна Польніцка, Абрам Бравэр, Арон Пайес, Янка Барада, Малка Атлас, Сора Міхалевіч, Гітля Шохновіч, Хая Шацка, Міхась Гарошка, Дора Зільбэрштэйн, Явель Кулік, Уладзімер Паддубік, **Янкель Ваўпянскі (Ўцёк).**

✕ **Забастоўка.** 1 красавіка с. г. распачалася забастоўка працаўнікоў электрычнае станцыі і вадаправоднае, якая трывала да 2 красавіка (адзін дзень). У часе забастоўкі электроўню абслугівала войска. Дамаганні бастуючых здавольнены.

✕ **Колькі жыхароў у Горадні.** Паводле апошняй рэгістрацыі магістрата агульны лік жыхароў у м. Горадні на 1/I—27 г. складае 46286 асоб.

За 1926 г. нарадзілася 600 асоб, якіх ахрысьцілі ў каталіцызм, 173—у праваславіе 434—юдэізм і 4 бэзвызнанёўцаў і інш.

За 1926 г. памерла каталікоў 408 асоб, 124 праваслаўных, 280 жыдоў, 11 бэзвызнанёўцаў і інш. рэлігіі.

Вось бачу йзноў...

Вось бачу йзноў
З чужых краёў:
Лятуць крылаты госьці.
Вас родны край —
Зялёны гай
Вітае Ягомосьці!
Пад зык вясны,
Пад шум лясны
Матыў жыцьця прыгожы!
Сустрэнем вас, —
Скарэй да нас
З далёкай падарожы!
Зіма тужыць,
Ужо нельга жыць —
Трашчыць і б'ець трывогу
Бо ж лiты зьнік,
Ужо сакавік
Далоў!.. Вясьне дарогу!

15./III. **С. Галыш.**

СОН.

Люлі, люлі люлі...
А чамуж-то так:
Усе паны паснулі,
А ня сьпіць бядак?
Няўжо сон-раскоша?
Няўжо так спакон:
Мужыку бяз гроша
У жалобу сон?

Люлі, люлі, люлі...
А чамуж та так:
Каго ў рог сагнулі,
Дурню той сваяк.
Няўжо так вядзецца:
Крыўда, мус і зьдзек...
Калі-ж засьмяецца
Мужык—чалавек!

Люлі, люлі, люлі...
На літасьць не чакай;
Карак бацькі гнулі,
Дык свой ня згінай.
Пніся скрозь наперад...
Для ўсіх смутны сон;
А праўвецца верад —
Гаспадар пакон!

Югаславія. **М. Запольскі.**

Карэспандэнцыі.

Жыцьцё нашае інтэлігенцыі.

(Слонімскага павету).

Мусіць, ні ў воднай культурнай старане ня чуваць, каб гэтак марнаваліся сілы працоўных інтэлігентаў, як у нас на Беларусі пад Польшчай.

Колькі іх ёсьць па вёсках без адпаведнай працы, змушаных выжыўляцца з свайго гароду, набытага да вайны або з тае баразны, што заставіў яму малазямельнік бацька, аддаўшы астатні крывавы грош на вучэньне свайго сына, або дачкі, каб тыя гэтак не цярпелі, як ён. Ці спадзяваўся ён тады, што яго дзецям прыдзецца больш цярпець, як яму.

Колькі іх гэтых быўшых вучыцялёў, паштавікоў і іншых чыноўнікаў, або тых, што не пасьпелі яшчэ служыць, бо паканчывалі гімназіі ўжо ў вайну, сядзяць цяпер на ласкавым хлебе бацькоў або братоў, якія няраз ужо коса паглядаюць на іх. Чаму гэтак яны церпяць? Чаму дарма марнуюцца іх сілы? Няўжо-ш на бацькаўшчыне няма ім месца? А такі і няма, бо ў большасьці ў канцэлярыях, на пошце, і ў школах панасаджаны „сваі“ галіцэйскія, пазнанскія і варшаўскія людзі. А ўроджаным тутака, на сваей Бацькаўшчыне, былі-б можа і да народу лепшыя, бо яны яго разумелі-б, а народ іх.

Мучацца і церпяць дарослыя, церпяць і нашыя дзеці, вучачыся не ў сваей — беларускай, а ў польскай, школе, ходзячы ў яе за 3 — 5 і больш вёрст у мароз і завею. А якая карысьць з усяго гэтага? Прахадзіўшы гэтак тры зімы, вучань ледзь-ледзь расьпісацца можа, а паданьне якое аб зняцьці кары, або ліст падпісаць і ня могуць, бо чужое гэта для іх і нічога яны не разумеюць. Чытаць хоць крыху і навучыліся, хутка зусім забудуцца, бо чытаць кніжак польскіх ня могуць — многа ў іх не зразумеюць.

Дзеля таго і імкнуцца за граніцу ўсе, хто толькі можа вырвацца: у Аргэнтыну і ў Канаду і ў Кубу, і ў Францыю і ў Нямеччыну. А колькі іх ідзе ў Расею, і зьлічыць трудна; едуць і ідуць на нядолю, на мучэньне: ведама, што на чужыне добра быць ня можа: дадуць тое, што з носа спала, але і то дзякаваць ім усім, бо інакш пагінула-б шмат нашых людзёў.

Вось, як прыклад, (а іх сотні можна падаць): У вёсцы Бяніцкаўшчыне, Казлоўскае вол., Слонімскага пав., ёсьць Пётра Лішык, які служыў на пошце каля 30 гадоў і даслужыўся быў ужо да чыноўніка другога разраду, ажно цяпер яму няма месца нідзе і змушаны быў сесьці і адабраць ад брата нейкую вузенечкую стужачку зямлі, каторую, каб зложыць разам, то добрага гароду ня было-б. А колькі сваркі і няпрыемнасьці было з усяго гэтага, бо надзел у Бяніцькаўшчыне малы і так падзелены.

У вёсцы Гербялявічы быўшы вучыцель Макарэвіч, скончўшы беларускія вучыцельскія курсы, цяперака мусіць марнець над маленькай гаспадаркай, якую пакінуў яму бацька і марнаваць нязздольную да гаспадаркі жонку.

Гледзячы на сотні такіх прыкладаў, так і хочацца крыкнуць у-ва ўсе грудзі, каб чуў увесь сьвет, калі ўсё гэта скончыцца, калі палепшае нашае жыцьцё?...

А. Надзея.

Як выкручваюцца ад падаткаў.

(Горадзенскі пав.).

Неяк перад Каладамі прыехаў да нас сэквестратар сьцягіваць з сялян нашае воласьці і разам з пана Сапегі падаткі. З сялянам доўга гутарыць ня прышлося, раз-раз і тыя заплаці, што належалася, а з Сапегам іншая справа, ён, як хітры, дык і да гэтага часу не заплаціў. У той час наш сэквестратар апісаў у яго чатыры стагі жыта ў маёнтку Пратасаўшчына нібы то за падатак. Адміністратар маёнтку пастараўся ўжо загадзя, каб абараніць апісаныя стагі; ён напісаў куды трэба, што ўсе дворныя двара Пратасоўшчына сядзяць бяз хлеба і што трэба малаціць апісаныя стагі жыта, каб даць ім хлеба. У лютым месяцы прышла папера з Варшавы, загадваючая дасьледзіць гэту справу.

Адміністратар казаў сэквестратару, што Сапега дасьць падатак, але трэба толькі, каб сьведкі падпісаліся, што сапраўды трэба вымалаціць усе чатыры стагі жыта на хлеб для дворных. Сьведкі згаджаліся падпісацца пад сьведчаньнем у якім было сказана, што два стагі трэба абавязкова вымалаціць, але ніколі не чатыры. I тут сабе пан Сапега даў рады. Гэтых сьведкаў адкінуў а на месца іх знашоў другіх з вёскі Раманоўшчына, якія і падпісаліся, што для дворных трэба вымалаціць ўсе чытыры стагі жыта. Цяпер ясна, што ён можа вымалаціць усе чатыры стагі, не заплаціўшы падатку. Крупяць, муцяць паны і ім удаецца, а ты селянін і не заплаці, дык і кажух з плячей змушаны будзеш аддаць. **Чуткі.**

Далёка да дабрабыту...

(Абразок з Маладэчанскага пав.).

Кабета з в. Павязынь, Радашкоўскай гм., П. Вахнюк жывець проста бяз ніякага прытулку. Сядзіць кутам з дзяцьмі ў ляснікоўвай хаце водаль ад вёскі ў лесе. Усе абарваныя і босыя. Харчуюцца толькі тым, што пойдзе да якога спагаднага грамадзяніна і папросе які гарнец бульбы і з'ядуць бяз солі.

Дачулася неяк яна, што ксёндз Радашкоўскай парафіі даець нейкую запамогу для бедных, цёплую адзежу і грошы. З якіх крыніц узята гэта запамога, ня ведаю добра. Кажуць, што гэта некалі Амэрыка выслала для бедных. Абрадавалася мая кабета і, як сама каталічка, сабралася і, выходзячы, пацешыла дзетак, каб ня плакалі, што пойдзе да ойчэнькі, дастане грошы і купе ім усім па абаранцы. Дарогай яна проста аж падскакавала ад радасьці, што купіць солі, бо ўже каторы месяц бульбу ядуць нясоленую, купіць сярнічак, дзеткам па абаранцы, а можа яшчэ астанецца і на газу. Але скора яе радасьць перайшла ізноў у смутак. Калі прыйшла яна да ксяндза, дык не застала яго дома, быў недзе ў месьце. Прышлося ёй чакаць ад 9 гадз. раніцы аж да 2 папал. Прыйшоў ксёндз і зараз запытаўся: „a co, kobitko, powiesz dobrego“. Тая, хапаючы абедзьве рукі цалаваць, аблілася слязьмі і стала раcказваць аб сваім жыцьці і галодных дзетках, прасіла каб і ёй даў якую запамогу. Ксёндз пробашч, не зважаючы на ўсё гэта, адмовіўся ёй дапамагчы. Ня буду я тут пісаць, чаму вяльможны пробашч не зьвярнуў увагі на кабеціны слёзы і на галодных дзетак, бо й сам ня ведаю. Можа ксяндзоўскае такое мягкае сэрце ў адносінах да бедных, а можа гэта кабета яму зусім не спадабалася, бо, хаця сама яшчэ не старая, але была ў благой адзежы і ў надта падзёртых чаравіках.

Ведаю добра толькі тое, што калі названая кабета прыйшла дамоў, дык самлела ад жалю, увайшоўшы ў хату. Пэўна і вам, паваж. чытачы, стала-б сумна ад жалю, каб убачылі вось гэтакі абраз: Двое большых дзетак, не прычакаўшы маткі, галодныя плакалі, сколькі маглі і змогшыся зьвіліся на палку спалі абняўшысь. Меншая — сядушка таксама ня менш сплакалася, і відаць, дрэмлячы звалілася з печы, пабіла сабе нос і галаву, абкрываўшыся поўзала па пяску, абмачыўшыся таксама заснула палажыўшы галаву на парог, а валаскі яе прымерзлі да апошняга, бо тагды быў надта вялікі мароз. Самая маленькая на печы скацілася з трантаў і ляжала ніц на голай печы, забіла пяском нос і рот і ўжо не магла плакаць, а толькі хліпала і стагнала. Апомніўшыся крыху, матка ўстала, прыгледзіла дзетак і знайшла яшчэ пад лаўкай нейкіх пяць гнілых бульбін, бардзей аскабліла і бяз солі прыгрэла і ўняла голад бедных дзетак. Бацька ў той дзень хадзіў за 20 вёрст нейдзе ў Раёўку, думаў што дастане там якую работу ў паперні, але замест работы палучыў толькі цьвёрдае слова „піета“ і з гэтым паплёўся дамоў галодны, як воўк. Прыйшоўшы дамоў па поўнач і замест яды напіўся слёзаў і з гэтым лёг. Толькі жонка яму расказвала, як яна была ў ксяндза і бачыла, як кухарка прыгатаўляла на абед ксяндзу катлеты, кураціну і розныя салодкія пячэньні, дык ён аж прысьніў, што быццам быў таксама ў ксяндза і бачыў, як ксёндз гэта ўсё еў і нечым смачным запіваў. Але ж гэтым сном не насыціўся бедны бацька, а ўстаў чуць сьвет, працер вочы, згаварыў пацер, замест яды ізноў напіўся крывавых сьлёзаў і паплёўся ізноў ужо ў другі бок за вёрст 30, каб найсьці якую работу. Ведаю добра, што і гэта яго находка была бескарысна. **Міласэрны.**

Жыў беларус і будзе жыць!

(Пісьмо з Вялейкі).

Сэрца радуецца, як бачыш, што праца шырыцца, расьце і даець неспадзяваныя вынікі. Так і ў нас у Вялейцы.

26-га сакавіка быў прачытаны рэфэрат на тэму **„Роль песьняра нядолі ў дзеле нацыянальнага адраджэньня“**. Уваход быў бясплатны і ня толькі для сяброў Т-ва, а для усіх грамадзян. Слухачоў сабралася ня так многа ўжо, але як на падбор. Старыкоў таксама ня было, — усё моладзь, але моладзь, якая цікавіцца беларускім рухам і прынімаець актыўнае ўчасьце ў гэтым руху.

Рэфэрат прайшоў з нябывалым настроем. Пасьля рэфэрату былі прадэклямаваны вершы, якія канчаліся проста такім громам воплескаў і навет пры дэклямацыі аднаго верша: **„Родны край“** Якуба Коласа відаць было, што некаторыя сябры былі недалёка **ад** сьлёз.

Пасьля таго, як прадэклямаваны былі ўжо вершы вызначаныя, некаторыя з грамадзян так былі захоплены панаваўшым у гэты вечар настроем, што сталі дэклямаваць вершы, якія не ўвайшлі ў парадак дзенны, а адзін сябра, дык навет прапяяў,—„бо, кажа, я ніколі не дэклямую і ня ўмею дэклямаваць, а сьпяваю“.

У гэты вечар кожнаму прысутнаму стала ясна, што **жыў беларус і будзе жыць**, калі маець такія вершы, чытаючы якія плакаць хочацца, і маючы маладую інтэлігенцыю, якая ахвотна ахвяровываець свае сілы і знаньні на аўтар роднай культуры. Чэсьць Вам, маладыя барацьбіты за лепшую будучыню гаротнікаў Беларусаў! Жадаю Вам шчыра здароўя і сіл, якія могуць Вам прыгадзіцца на адбудову Беларускага храму культуры.

27 сакавіка, на другі дзень, быў пастаўлены спэктакль. Ігралі **„Сурдут і сярмяга“** і **„Пасланец“**. Спэктакль прайшоў таксама добра, нават надта добра. Глядзельнікамі былі, як ведама, адны беларусы. Ігралі наагул усе артысты добра. Відаць была падгатоўка. Пасьля кожнага акту глядзельнікі па колькі разоў вызывалі артыстаў. Воплескам ня было канца. У канцы апошняга акту, на жаданьне глядзельнікаў, двойчы прышлося прапяяць канчатковую песьню і, як фінал усяго гэтага, Старшыня Акружнай Управы Флягонт Валынец ад імя глядзельнікаў паднёс артыстам каробку цукерак. Аддаючы каробку ў рукі рэжысэру Вялейскага Беларускага тэатру, А. Каляды, шчыра дзякаваў артыстам за тое эстэтычнае здаваленьне, якое глядзельнікі атрымалі на сёньнешнім спэктаклі. Усе надта здаволены, што Беларускі тэатр у Вялейцы пачынаець заваёвываць сабе будучыню і глядзельнікаў, бо саля, якая можа зьмясьціць да 400 глядзельнікаў, была біткам набіта, а гэта сьведчыць, што Беларусы пачынаюць цікавіцца сваёй роднай культурай, сваім тэатрам, — і Вы патрапілі зацікавіць іх! У канцы прамоўца шчыра пажадаў далейшай творчай працы.

Каляда Аляксандар, прынімаючы падарунак, шчыра дзякаваў глядзельнікам і ад імя ўсіх артыстаў заявіў, што яны паложаць усе свае сілы, каб падняць наш родны Беларускі тэатр у правінцыі на такую вышыню, на якой стаяць тэатры нашых братоў Славян.

Яго словы былі пакрыты громам воплескаў.

Пасьля антракту быў пастаўлены яшчэ жарт у 1 акце **„Пасланец“**, які прымусіў глядзельнікаў ад душы пасьмяяцца.

На другі дзень толькі і было гутаркі, што пра ўчарашні спэктакль. Надта ўжо ён усім спадабаўся. Многія грамадзяне шкадавалі, што не пайшлі на спэктакль.

Спэктакль скончыўся скокамі, якія пачаліся традыцыйнай лявоніхай.

Вялейчанін.

31 сакавіка 1927 г.
г. Вялейка.

Нам пішуць з вескі што:

× Трэба давясьці да ведама сялян Казлоўскае гм., Слонімскага пав., што, як ходзяць чуткі, Цімафейчык з в. Майдовічы, які служыў калісь у гміне — уступіў у тайнікі і за 20 зл. у месяц робіць даносы на нашых сялян.

× Хлопцы вёскі Кісель ня маюць, відаць, лепшага занятку, як толькі напіцца гарэлкі і старацца, каб каго небудзь пабіць. Больш за усіх стараецца ў гэтым Зьмітрук Мельнік і Аляксандар Гера.

× Вучыцель польскай школы ў вёсцы Агароднікі Пяскоўскае воласьці Ян Зеленяк з Галіцыі вельмі дрэнна адносіцца да нашых дзетак—проста б'е іх бяз літасьці. Так вучня Васіля Тручка за тое, што той ня ведаў лекцыі з гісторыі, выкладанай, ведама-ж у польскай мове, гэты панок так зьбіў, што хлопец голы ўпёк ад яго на мароз і пабег так да хаты. Як біў яго „пан вучыцель“, відзелі вучні трэцяга і чацьвертага аддзелу і суседзі відзелі як хлопец бег да хаты бяз шапкі і ў аднэй рубашцы. Ведама, што цяжка нашым дзеткам вучыцца папольску, дык няма дзіву, што ня могуць яны прыгатаваць як належыцца лекцыю. Але ці-ж за гэта трэба іх біць так па твары і кідаць аб зямлю, як гэта робіць вучыцель Ян Зеляняк?

× У вёсцы Сакалова, Пяскоўскае гміны, Косаўскага павету солтыс Пунько Пётра, хочучы угадзіць паном і паўпанкам, устаўляе свае законы. Так 23 сьнежня, як вартавалі ўначы Юркевіч Ігнат і Юркевіч Аляксандар успомнены солтыс пачаў вымагаць ад іх каб прынясьлі сена і аўса для паліцыянтаў, што стаяць у яго доме. Калі-ж вартаўнікі адмовіліся, кажучы, што паліцыянты могуць купіць аўса і сена, — дык солтыс стаў біць іх палкай па галаве і па грудзях. А паліцыя ў дабавак да гэтага яшчэ сьпісала на вартаўнікоў пратакол.

× Солтыс вёскі Застарынцы, Пачопаўскай воласьці, Навагрудзкага павету, забірае з воласьці ўсе беларускія газэты і замест таго, каб аддаць іх падпішчыкам выкарыстоўвае іх для свайго ўжытку, а калі і дасьць каму газэту—дык праз нейкі тыдзень, калі яна ўжо сто разоў можа быць прачытана і ўстарэла. Вось чаму грамадзяне вёскі Застарынцы так рэдка атрымоўваюць—беларускія газэты.

З-за акіяну.

Як жывецца нашым эмігрантам у Аргэнтыне.

Дома нашаму брату жывецца дрэнна, але ў Аргэнтыне яшчэ горш. Зразу па прыезьдзе заработкаў мала і цяжкія яны вельмі. Працу можна знайсьці найчасьцей пры пракладаньні чыгунак, сеч лясы, дзёрці карчы, разрываць скалістыя горы і то працаваць трэба пры такой гарачыні, што нашаму брату вельмі цяжка вытрымаць. Адным словам вельмі цяжкія варункі працы, а заработкі невялікія—адзін даляр у дзень пры ўсім сваім і гэткі заработак не заўсёды бывае, тады і за меншую плату прыходзіцца дзёрці карчы і каменьні і рукамі і зубамі проста. Дабрацца да Аргэнтыны таксама ня так лёгка, асабліва калі ехаць пры помачы агенцтва „Cosulich line“ (месьціцца ў Вільні на вул. Колеёвай № 15). Гэта самая найгоршая лінія ў Польшчы, бо тут самыя горшыя ашуканцы. Яны толькі і стараюцца, каб ашукаць нашага чалавека і выцягнуць апошні грош. Калі зьбіраецца ў дарогу, дык кажуць у „Cošulich line“, што і даедзе добра, і што там яму будзе добра, а пасьля адпраўляюць людзей, як скаціну, на караблі ня толькі няма месца дзе легчы ці сесьці, але і стаяць няма гдзе. Нечыстата страшна вялікая, а кормяць так, што ў нас гаспадар сьвіней лепш корміць; калі-б ня меў сваей ежы—дык хоць ты з голаду памірай. Мала таго — дык яшчэ і служачыя на караблі ўсімі спосабамі стараюцца вас абкрасьці.

Так што ўсякі наш брат беларус, пакуль зьбярэцца ехаць у Аргэнтыну—няхай прыме да ведама ўсё тут сказанае ды раздумаецца добра і няхай будзе асьцярожны ў выбіраньні марскога агенцтва, якое-б яго мела завязьці ў Аргэнтыну. **Эмігрант.**

Паштовая скрынка.

Бічу Я. Выкарыстоўваем толькі частку, іншае не падыходзіць. — **Н. Дзяміду.** Тое самае. — **Прысутнаму.** Карэспандэнцыя Ваша вельмі цікавая, але не зьмяшчаем, бо цяпер за яе сканфіскуюць. — **М. Бываламу.** Вершы Вашы слаба апрацаваны, таму да друку не падыходзяць. — **Чуткаму.** Выкарыстоўваем толькі частку, астальное не на часе. — **Сівому З.** Падзякі за грамадзкую ахвярнасьць ужо зьмяшчаць ня можам. — **З. Сівому.** Пераклад Ваш вельмі слабы, таму не зьмяшчаем. — **Недатопку.** Ваша карэспандэнцыя падвяла б газэту пад канфіскату. — **Андрэю Грымотнаму.** У вершах Вашых чуецца столькі сьлёз і суму, што нясе ад іх холадам. Вось-жа, ня хочучы халадзіць нашых чытачоў—не зьмяшчаем іх. — **С. Галышу.** У Вас ёсьць зусім добрыя вершы, прысылайце, будзем зьмяшчаць.

Усячына.

На якой вышыні чуваць гукі.

У Нямеччыне дасьледвана, што голас чалавека чуваць на вышыні 500 мэтраў, гукі аркэстру—на вышыні 1.400 мэтраў, выстрал з гарматы — на вышыні 1.800 мэтраў, сьвісток цягніка—на вышыні 3.050 мэтраў. Гэта наконт гукаў, якія ідуць зьнізу ўверх. Калі ж пускаць гукі зьверху ўніз, дык такіх вынікаў ня будзе.

Жывёла ў кіно.

У апошніх амэрыканскіх кіно-фільмах выдатныя ролі выконвае жывёла. Асабліва праславіўся за апошнія часы конь „Рэкс“, які іграў у 70 кіно-фільмах. Конь гэты застрахаваны ў 500.000 р. У часе яго хваробы бюлетэнь пра яго здароўе друкаваўся амаль што ва ўсіх амэрыканскіх газэтах. Таксама праславіўся сабака „Дружок“, застрахаваны ў 200.000 руб. Гэты сабака прымаў удзел у 120 кіно-фільмах.

Хто чытае нашу газэту і не прысылае падпіскі, той ня спрыяе разьвіцьцю роднай беларускай прэсы.

БРАТЫ! Прысылайце падпісную плату, а хто задоўжыўся, выраўняйце свой доўг.

БРАТЫ! НЕ ЗНІШТАЖАЙЦЕ СВАЕ БЕЛАРУСКАЕ ГАЗЭТЫ; ПРАЧЫТАЎШЫ, АДДАЙЦЕ СУСЕДАМ.

Рэдактар-Выдавец: С. Татарын.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.